■ Добрая навіна

# ВЁСКІ АБ'ЯДНАЛІСЯ З «ВЯЛІКАЙ ЗЯМЛЁЙ»



Фота Караліны КУЧУК.

**Як чатыры кіламетры ператвараюцца ў 60, добра ведаюць жыхары чатырох вёсак у Карэліцкім раёне. Яшчэ літаральна пару тыдняў таму ім прыходзілася чакаць аўталаўку, хуткую дапамогу і нават пажарнікаў ледзьве не па паўтары гадзіны. Стары драўляны мост цераз Нёман, які злучаў пасяленні з «вялікай» зямлёй, не прымаў машыны, што важылі звыш дзвюх тон. Цяпер у распараджэнні людзей 100 метраў асфальтабетоннага пуцеправода з 8-метровай праезнай часткай і метровымі тратуарамі паабапал.**

Драўляны мост, тэрмін службы якога пяць гадоў, быў збудаваны тут амаль 20 гадоў таму, а апошні капітальны рамонт рабіўся ў 2008-м. Абмежаванні па вазе праз аварыйнасць і недасканаласць канструкцыі прыводзілі да таго, што 4-кіламетровая адлегласць ад Ярэміцкага сельсавета да Сіняўскай Слабады, Рудзьмы, Антанёва і Чорнай ператваралася для цяжкавозаў у 60-кіламетровы аб'язны шлях праз суседні раён.

Дарэчы, цяжкавата было праязджаць цераз мост і на легкавых аўто. Карэспандэнт «Звязды» ўпэўнілася ў гэтым «на ўласныя колы». Размінуцца на мосце нельга, рухацца па ім трэба асцярожна, бо вузка, дзе-нідзе і дзіркі сустракаліся. І гэта летам. Пра зіму падумаць страшна.

А яшчэ некалькімі дзесяцігоддзямі раней Нёман увогуле гаспадарыў над жыццём сялян. Старажылы ўспамінаюць, што драўляных мастоў было некалькі, але ж крыгі ў паводку зносілі іх з сабою. Прадукты вазілі на лодцы, а пасля вайны нават функцыянаваў паром, на які стаялі кіламетровыя чэргі з вазоў з сенам. А за дастаўку брыкет абыходзіўся зарэчанцам удвая даражэй.

Свежазбудаваны мост можа вытрымаць нагрузку ў 100 тон. Тутэйшыя задаволены перш за ўсё тым, што будуць у час атрымліваць усю неабходную дапамогу. Пажарныя, напрыклад, абяцаюць з'явіцца праз 10 хвілін пасля выкліку. А яшчэ стане зручней хадзіць у грыбы ды нарыхтоўваць дровы на зіму.

Мясцовае кіраўніцтва таксама мае вялікія планы на выкарыстанне магутнай пераправы. **Дырэктар ДП «Царука» Аляксандр ЛЕЙКА** мяркуе пачаць меліярацыю, арашэнне і рэкультывацыю занёманскіх зямель, засеяць іх травой. Больш за дзевяць гадоў 2000 гектараў сенакосаў і ралля былі эканамічна нязручнымі для выкарыстання. Цяпер яны запрацуюць на дабрабыт гаспадаркі.

А **старшыня Ярэміцкага сельсавета Пётр НАУМОВІЧ** у хуткай будучыні прадбачыць павышэнне цікавасці да мясцовых краявідаў і зямлі з боку прыватных уласнікаў. Каля трох гектараў з «таго берагу», што яшчэ нядаўна быў амаль недасягальны, пойдуць з аўкцыёну. Летам насельніцтва тут і павялічваецца дзякуючы дачнікам. Цяпер ахвотных мець хатку на вёсцы за некалькі метраў ад ракі і непадалёк ад Налібоцкай пушчы відавочна пабольшае. Ды і ўмовы працы палепшацца. Сёлета, напрыклад, індывідуальныя прадпрымальнікі ўжо арандавалі каля 60 гектараў зямлі пад авечкагадоўлю.

Жыццё новага моста разлічана не менш як на 100 гадоў, кажуць будаўнікі. За гэты час жыццё тут, пэўна, завіруе. Бяспечны шлях гэтаму спрыяе.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*
*Карэліцкі раён.*

■ Духоўнае

# Рыхтуйце ў падарунак дабрыню

**Напярэдадні Каляд і Новага года мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі і мітрапаліт Мінска-Магілёўскі, кіраўнік Канферэнцыі каталіцкіх епіскапаў Беларусі архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч расказалі, якім чынам прынесці свята не толькі ў жытло, але і ў сэрца.**

У Беларусі Раство адзначаюць двойчы. Архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч лічыць, што гэта асаблівасць не розніць людзей, а наадварот, падкрэслівае нашу еднасць:

— Розніца ў календарах, адрозненні ў абрадах — гэта не розніца ў верах. Мы верым, што ў кананічную дату, 25 снежня, на зямлю прыйшоў Збаўца, толькі вылічваем гэтую падзею па розных стылях. У беларусаў многа змяшаных сем'яў, аднак ніхто не сварыцца з гэтай прычыны, і нашы цэрквы-сёстры стараюцца, каб такі парадак, мір і згода падтрымліваліся надалей. У вас свята — мы да вас прыйдзем, мы святкуем — з радасцю сустрэнем у госці вас.

Мітрапаліт Павел прытрымліваецца падобных думак. У сваім выступленні ўладыка асаблівую ўвагу ўдзяліў традыцыйнаму ўспрыманню Раства:

— Гэта цудоўнае свята і надзвычай важная падзея: Хрыстос сышоў да нас, каб вярнуць страчаную сувязь з Богам і адкрыць для нашых душаў дарогу на неба. Многія лічаць, што гэта свята, калі ўпрыгожваюць дом, гатуюць смачныя стравы і рыхтуюць падарункі. Безумоўна, так заведзена, але хацелася б успомніць яшчэ адзін складнік, без якога немагчыма ўявіць Раство, — гэта падрыхтоўка для таго, каб прывітаць Хрыста. Мы стараемся ачысціцца як фізічна, так і духоўна, сустрэць светлы дзень з чыстым сэрцам і добрымі думкамі.

Святары закранулі тэму хрысціянскіх традыцый і падрыхтоўкі да адной з самых важных дат у царкоўным календары. Напрыклад, сёння, калі людзі кажуць пра пост, то часцей за ўсё маюць на ўвазе ўстрыманне ад ежы. Але проста ўстрымлівацца ад некаторых прадуктаў — гэта дыета. Духоўны пост, па словах мітрапаліта Паўла, — гэта калі асноўнай задачай чалавека становіцца ахова сваёй душы.

— Падрыхтуйце ў падарунак не толькі рэчы, але і добрыя справы. Хай нічога злога ад нас не ідзе, — пажадаў уладыка.

— На жаль, усё часцей мы назіраем, як добрыя справы камерцыялізуюцца. Іх робяць не для пашырэння дабрыні, а дзеля прыцягнення ўвагі, — падтрымаў духоўнага калегу Тадэвуш Кандрусевіч.

Як і штогод, напярэдадні Новага года ў краіне пройдуць святочныя дабрачынныя мерапрыемствы. Настаяцелі прыходаў ведаюць людзей, якія бываюць там, і стараюцца ім дапамагаць. Калі чалавек стары, нямоглы або захварэў, то чаму б не паспрыяць яму — прывезці ў царкву на малебен, дапамагчы прыбраць у кватэры, купіць лекі, прадукты... Да свята Раства ў мінскім каталіцкім прыходзе касцёла Святога Роха дабрачынная арганізацыя «Чыстае сэрца» рыхтуе для дзяцей калядныя вечары — такія дабрачынныя ранішнікі.

У некаторых мясцінах Беларусі захаваўся абрад калядавання. Людзі пераапранаюцца ў традыцыйных для свята персанажаў і з песнямі і пажаданнямі ходзяць па дварах.

— Ёсць розніца паміж калядкамі і слаўленнем, — тлумачыць мітрапаліт Павел, — я лічу, што калі дарослыя і дзеці спевамі праслаўляюць нараджэнне Хрыста, жадаючы усім людзям шчасця, дабра, то гэта цудоўная традыцыя.

Напрыканцы сустрэчы іерархі цэркваў павіншавалі ўсіх са святамі, пажадалі міру, дабрабыту, спакою і радасці ў сэрцах.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Уначы істотна падмарозіць

## У чацвер чакаецца да мінус 10—12 градусаў

**На гэтым тыдні ў нашай краіне чакаецца зімовы характар надвор'я з ападкамі пераважна ў выглядзе снегу і адмоўнымі тэмпературамі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння пад уплывам актыўных атмасферных франтоў па ўсходзе краіны пройдзе снег, чакаецца завіруха. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад нуля да мінус 5 градусаў. А вось у сераду і чацвер, 20 і 21 снежня, надвор'е будзе фарміраваць у асноўным вобласць паніжанага атмасфернага ціску. У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах месцамі магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 марозу, пры праясненнях — да мінус 8—11 градусаў. Удзень — ад нуля да мінус 6 градусаў.

Самы халодны дзень тыдня будзе чацвер. Уначы 21 снежня ў асобных раёнах Беларусі пройдзе невялікі снег, днём месцамі, пераважна па захадзе краіны, чакаецца кароткачасовы снег. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 марозу, пры праясненнях — мінус 10—12 градусаў. Удзень будзе ад нуля да мінус 7 градусаў.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у пятніцу чакаецца рух атмасфернага фронту з боку Заходняй Еўропы, услед за якім будзе пастулаць больш цёплае атлантычнае паветра.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | – капитальное строение, инв. №431/С-13338 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 163,2 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, Мирский с/с, д. Симаково, ул. Первомайская, 65;<br>– капитальное строение, инв. №431/С-13261 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада), общей площадью 112,6 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, Мирский с/с, д. Симаково, ул. Первомайская, 65;<br>– многолетние насаждения |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 423375707601000119, площадью 0,2130 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина) по адресу: Кореличский р-н, Мирский с/с, д. Симаково, ул. Первомайская, 65 |
| Начальная цена продажи | 9 274,80 руб. (девять тысяч двести семьдесят четыре рубля восемьдесят копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 927 руб. (девятьсот двадцать семь рублей) |
| Продавец | Кореличский филиал Гроднооблпотребобщества, 231430, г. п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28, тел. 8 01596 2-14-84 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 19 января 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 15 января 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

**ОАО «Світанак» г. Жодино приглашает организации принять участие** в переговорах по выполнению комплекса строительно-монтажных и пусконаладочных работ на объекте «Замена оборудования ГРУ и средств автоматизации котла ДЕ 10-14ГМ в котельной ОАО «Світанак» г. Жодино».

Заявки принимаются по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 15.00 27.12.2017 г. За дополнительной информацией обращаться по тел.: 8 (01775) 7-14-92, 7-97-74.

УНП 600038919

**Отказ от проведения аукционных торгов**

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» извещает об отказе от проведения 20 декабря 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №7» и расположенного по адресу: Витебская область, г. Витебск, ш. Бешенковичское, 28, 28/1, 28/2, 28/3, 28/4, 28/5, а также по адресу: Витебская область, Бешенковичский район, г/п Бешенковичи, ул. Урицкого, 106.

Извещения о проведении торгов были опубликованы в газете «Звязда» 08.12.2017.

Телефон для справок (017) 327-48-36.

УНП 190398583